Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
23 ВЕРАСНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 184 (28294)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Праца да пенсіі: каго не звольняць па ўзросце?**
СТАР. 3



**Фізіка без падручнікаў: паглядзець і памацаць**
СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, першы намеснік міністра аховы здароўя:**

*«З 2017 года мы змяняем сістэму дыспансерызацыі. Мы адыходзім ад усеагульнай дыспансерызацыі, звяртаем увагу на мэтавыя скрынінгі. З увядзеннем электроннай карты і гісторыі хваробы будзе змяншацца колькасць паўторных візітаў у паліклініку. На падставе запоўненых анкет можна будзе скласці індывідуальную праграму харчавання, фізічнай актыўнасці, кантролю артэрыяльнага ціску і іншае. Да канца года ва ўсіх паліклініках Мінска будуць уведзены электронныя рэцэпты. У 2017 годзе плануецца ўвесці электронныя амбулаторныя карты. Па сутнасці, гэта будзе асабісты кабінет, дзе кожны зможа ўбачыць інфармацыю пра сваё здароўе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9334 | ▼ |
| Еўра | 2,1719 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0302 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0746 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Магутная стваральная сіла



Фота БЕЛТА.

## Прэзідэнт разлічвае на больш глыбокае далучэнне царквы да сацыяльных працэсаў

**Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў падчас сустрэчы з Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што БПЦ займае вядучае месца ў жыцці краіны, аднак ёсць і іншыя канфесіі. «Вельмі важна, каб праваслаўная царква працягнула садзейнічаць умацаванню міжканфесійнай згоды ў Беларусі, дэманструючы ўзор цывілізаваных адносін, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы заўсёды мірна існавалі дзякуючы разумнай, узважанай палітыцы дзяржавы і праваслаўнай царквы ў дачыненні да каталікоў і іншых вернікаў. Мая пазіцыя адназначная: нам дзяліць у гэтым свеце няма чаго. Вы як магутная, буйная канфесія павінны іншых паважаць і падтрымліваць».

Значны напрамак дзейнасці царквы — выхаванне падрастаючага пакалення і прыцягненне яго да ўдзелу ў розных сацыяльных праектах. «У краіне створаны выдатныя ўмовы для вучобы і працы, вядзецца работа па падтрымцы таленавітай моладзі.

СТАР. 2




Фермерская гаспадарка Зайцавых — адна з найбуйнейшых у Магілёўскім раёне. На 500 гектарах тут вырошчваюць капусту, моркву, перац, памідоры, цыбулю. Цяпер ідзе масавая ўборка цыбулі, пад якую занятыя 22 гектары. У хуткім часе сабраны ўраджай пойдзе на рэалізацыю ў Магілёў і не толькі. Гаспадар Міхаіл Зайцаў вынікам працы задаволены: сярэдняя ураджайнасць цыбулі сёлета склала каля 400 ц/га.

Фота БЕЛТА.

■ Камунальныя стасункі

## УБОРКА НА КОНКУРСНАЙ АСНОВЕ

### Хто наводзіць парадак у сталічных пад'ездах

**Ужо паўтара месяца жыхары Ленінскага раёна назіраюць за людзьмі ў нязвыклай уніформе, якія з упэўненасцю вычышчаюць месцы агульнага карыстання ў іх дамах. Аказалася, што абавязкі па ўборцы пад'ездаў ад ЖЭУ перайшлі прыватнай клінінгавай кампаніі. Мы пацікавіліся, чым выкліканы гэтыя перамены і пра якія вынікі дзяржаўна-прыватнага «камунальнага» партнёрства ўжо можна гаварыць?**

### Якія паслугі можна атрымаць за 53 капейкі?

Сёлета ў ліпені была праведзена працэдура па выбары падраднай арганізацыі, якая гатова была займацца санітарным утрыманнем дапаможных памяшканняў жыллёвага фонду ў Ленінскім раёне. У тэндары прынялі ўдзел 4 ЖЭУ і прыватная клінінгавая кампанія. Галоўным крытэрыем выбару быў ніжэйшы адносна канкурэнтаў кошт паслуг. Максімальная сума за год, на якую гатовыя былі пагадзіцца прадстаўнікі ЖКГ — 1 мільён 150 тысяч дэнамінаваных рублёў (ці 11,5 мільярда рублёў на старыя грошы).

СТАР. 4

■ Занятасць

## ЗАРОБКІ БУДУЦЬ РАСЦІ?

### Сітуацыя на рынку працы паляпшаецца: каб прыцягнуць добрых спецыялістаў, наймальнікі павінны будуць ім больш плаціць

**Чацвёрты месяц запар зніжаецца колькасць беспрацоўных. З мая людзей, якія стаяць на ўліку ў службах занятасці, паменшала на 11 тысяч (на 21 працэнт). Затое вакансій прыбавілася: плюс 2,6 тысячы ў параўнанні з пачаткам лета. Гэты верасень прапануе на працу больш свабодных месцаў, чым было год таму.**

### Ажыўленне ў прамысловасці і будаўніцтве

Чаму сітуацыя з занятасцю стала паляпшацца?

— Прычын шмат. Гэта і сезонная актыўнасць, і пэўная стабілізацыя эканомікі, і ўвядзенне новых працоўных месцаў, — пералічвае **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Мінпрацы і сацабароны Алег ТОКУН**.

СТАР. 4

# Магутная ствaральная сіла

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак перад грамадствам рэгулярна ўзнікаюць новыя задачы, у вырашэнні якіх патрэбны больш актыўны ўдзел царквы. Не скажу, што дзяржава і святары мала робяць, але трэба знайсці той далікатны падыход, ласцівы царкве ў гэтым працэсе, — упэўнены беларускі лідар. — Яна павінна мець ініцыятыўныя, адукаваныя і высокамаральныя кадры. Таму дзяржава аказвае і будзе аказваць усямерную падтрымку духоўным школам БПЦ у падрыхтоўцы святароў. Так, як і іншых цэркваў. Іншыя канфесіі павінны ўзяць прыклад з праваслаўнай царквы і рыхтаваць святароў з ліку грамадзян Беларусі. Тут павінны служыць беларусы, няхай замежнікі і бясконца адданыя нашаму народу і дзяржаве. З першых дзён свайго прэзідэнцтва я праводжу гэтую лінію, перш за ўсё ў дачыненні да каталікоў. І зрухі ашаламляльныя: вельмі шмат прыйшло святароў-беларусаў у каталіцкую царкву».

Было выказана меркаванне, што неабходна актывізаваць працу грамадскай кансультацыйнай рады па маральнасці, якая паспрыяла б выхаванню моладзі. Прэзідэнт падтрымаў гэтую прапанову, адзначыўшы, што ў яе трэба запрасіць зацікаўленыя структуры, свецкіх асоб і саму моладзь.

Яшчэ адной тэмай шчырай і працяглай гутаркі, падчас якой бакі дамовіліся не рэтушаваць і не хаваць праблемы, а вырашаць іх, стала ўзаемадзеянне епархій і мясцовых органаў улады, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Было адзначана, што ім неабходна нарошчваць і ўмацоўваць супрацоўніцтва, каб яно стала яшчэ больш канструктыўным і эфектыўным.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што царква заўсёды натхняла дойлідаў на стварэнне архітэктурных шэдэўраў. «Шматлікія храмы ў Беларусі з'яўляюцца помнікамі гісторыі і культуры, і сёння гэтыя будынкі патрабуюць асаблівай увагі. На працягу многіх гадоў дзяржава рэгулярна аказвае і будзе аказваць пасільную дапамогу ў іх аднаўленні. Разам з тым у святароў ёсць магчымасць на сваім узроўні звярнуцца да людзей, не толькі да дзяржавы, з заклікам аб удзеле ў адраджэнні страчанага: тады цаніць больш будуць», — сказаў Прэзідэнт.

На сустрэчы было адзначана, што ўжо доўгі час ідзе рэканструкцыя Жыровіцкага манастыра, які з'яўляецца адной з візітных картак Беларусі. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што завяршыць аднаўленчыя работы неабходна ў самыя кароткія тэрміны.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што асновы праваслаўнай царквы — справядлівасць і чалавекалюбства — натхнялі людзей на подзвіг і дапамагалі з годнасцю перажываць самыя цяжкія часы. «У аснову сваёй палітыкі я паклаў менавіта гэтыя каштоўнасці — справядлівасць і любоў да людзей», — заявіў беларускі лідар.

Было адзначана, што, працягваючы ўмацоўваць дзяржаўнасць і незалежнасць Беларусі, важна абапірацца на царкву. «Асабліва падкрэслю канструктыўную пазіцыю духавенства ў дачыненні да сучасных палітычных падзей, якія адбываюцца ў нашай краіне. Гэта ў чарговы раз даказвае вашу зацікаўленасць у беларускай дзяржаве, якая дынамічна развіваецца», — перакананы Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў царкве за тую працу, якую яна прыўносіць у агульную скарбонку развіцця Беларусі і грамадства, і выказаў перакананасць, што далейшая сумесная работа будзе па-ранейшаму мець стваральны характар і дазволіць скаардынаваць намаганні па ўмацаванні грамадства і яго духоўнаму ўзбагачэнні. «Царква — гэта не грамадска-палітычная пляцоўка, а асобная сіла. Магутная стваральная сіла», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

# Горад жыллём прырастае

**У Мінску ў 2017 годзе плануецца пабудаваць 644 тыс. кв. м жылля**

**Старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Дзмітрый ГУРЫНЕНКА адзначыў, што заданне на 2016 год па ўводзе жылля складае 735 тыс. кв. м.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, па выніках 9 месяцаў у сталіцы можа быць здадзена 530—560 тыс. кв. м. Гэта ўсяляе ўпэўненасць, што гадавое заданне будзе выканана ў поўным аб'ёме.

У 2017 годзе новыя жылыя дамы будуць узводзіцца ў раёне вуліц Міхалова — Алібегава, на месцы былой вёскі Сухарава, прадоўжыцца забудова ў Лошыцы-6 і Лошыцы-9, плануецца забудова ў Лошыцы-8 і Чыжоўцы (тут ідзе адсяленне жыльцоў). Будуць узведзены жылыя дамы і на тэрыторыі комплексу «Мінск-Мір». Цяпер там будуецца першы жылы аб'ект — «Дыядэма», у 2017 годзе пачнецца будаўніцтва яшчэ 5 дамоў.

Чарговай пляцоўкай для жыллёвага будаўніцтва стане ўчастак у межах вуліц Кабушкіна — Шышкіна (на месцы воінскай часці, якая вызваліць частку тэрыторыі). У 2018 годзе УКБ Заводскага раёна плануе пачаць тут жыллёвае будаўніцтва.

**Сямён РЭМЕЗАЎ.**

■ Дыялог бізнесаў

# У КРАІНЕ З'ЯВЯЦЦА АМАНСКІЯ ІНВЕСТАРЫ?

**Прадстаўнікі дзелавых колаў Амана зацікаўлены ў супрацоўніцтве з Беларуссю па шырокім спектры кірункаў. Па словах старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзіміра УЛАХОВІЧА, замежныя партнёры праяўляюць вялікую цікавасць да машынабудаўнічага кластара.**

«Беларускі бок ужо ажыццявіў першыя пастаўкі аўтобусаў МАЗ у Аман. Цяпер шэраг бізнесменаў праяўляюць цікавасць да муніцыпальнага аўтобуса МАЗ эканомкласа», — растлумачыў Уладзімір Улаховіч. Таксама ён апярэдзіў падзею і расказаў, што ў хуткім часе абодва бакі падпішуць пагадненне аб першых пастаўках тэхнікі кампаніі Амкадор у Аман.

Акрамя таго, у аманскіх прадстаўнікоў дзелавой супольнасці ёсць цікавасць у Беларусі да інвестыцый. У першую чаргу гэта сумесная вытворчасць прадуктаў харчавання з далейшай пастаўкай на рынкі ЕАЭС і краін Персідскага заліва.

«У нас у гасцях эліта аманскага бізнесу. Гэта ўплывовыя бізнесмены, якія валодаюць вялікімі актывамі і рэсурсамі сучаснай эканомікі Амана ад прамысловасці да нафтагазавага комплексу і прадуктаў харчавання. Але самае галоўнае, што ў іх ёсць вялікае жаданне супрацоўнічаць з нашай краінай», — растлумачыў старшыня гандлёва-прамысловай палаты.

Такая цікавасць невыпадковая, бо краіны, якія доўгі час фарміравалі свой бюджэт на аснове экспарту энерганосьбітаў, сёння маюць цяжкасці на глабальным рынку. Дзяржавы Персідскага заліва паставілі задачу па дыверсіфікацыі сваіх нацыянальных бюджэтаў і таму імкнуцца сёння развіваць шэраг ключавых галін.

«У гэтым сэнсе для іх наша краіна вельмі важны партнёр, паколькі ў нас добра развіты прамысловасць і аграрны сектар. Мы сёння можам прапанаваць тэхналогіі і аб'екты, у якія можна інвеставаць, і далей развіваць сучасныя праекты», — падкрэсліў Уладзімір Улаховіч.

**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ** адзначыў, што самы высокі тавараабарот за час супрацоўніцтва з Аманам быў у 2012 годзе, калі ён перавысіў 12 млн долараў. Сёння гэта тая планка, да якой можна імкнуцца.

Сталіцу наведала дэлегацыя дзелавых колаў Амана. У яе складзе кіраўнікі 40 кампаній, якія прадстаўляюць асноўныя сектары эканомікі краіны: нафтагазавай галіны, хімічнай, горназдабыўной прамысловасці і машынабудавання, буйныя інвестары, прадстаўнікі IT-сектара. Сёння гэта самая вялікая дэлегацыя са згаданай краіны, якая прыязджала ў Беларусь за апошнія 20 гадоў. З беларускага боку таксама высокая зацікаўленасць — развіваць дзелавыя кантакты з замежнымі калегамі прыехалі прадстаўнікі каля 80 айчынных прадпрыемстваў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■ Фінансы

# ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

**Міжнародныя аўдытарскія кампаніі правялі незалежную ацэнку якасці актываў беларускіх банкаў**

**Правядзенне такой ацэнкі ініцыяваў Нацыянальны банк, а сама працэдура ацэнкі ахоплівала 9 найбуйнейшых банкаў, доля якіх складае больш за 92 працэнты сукупных актываў усёй банкаўскай сістэмы краіны.**

Ацэнка паказала, што паказчык дастатковасці капіталу ўсяго банкаўскага сектара па стане на 1 жніўня склаў 10,76%. «Такім чынам, асноўны паказчык устойлівасці банкаўскага сектара да прымаемых рызык — каэфіцыент дастатковасці капіталу, у тым ліку з улікам кансервацыйнага буфера — знаходзіцца на ўзроўні, які дазваляе паспяхова супрацьстаяць магчымаму ўздзеянню негатыўных фактараў», — лічаць у Нацбанку.

Было выяўлена, што Беларусбанк, Прыёрбанк, Белгазпрамбанк, Банк ВТБ (Беларусь), БПС-Ашчадбанк, і Банк БелВЭБ маюць дастатковы запас нарматыўнага капіталу ў выпадку магчымага пагаршэння фінансавага стану пазычальнікаў, а таксама пагаршэння агульных знешніх і ўнутраных эканамічных умоў. А ў Беларусбанку, доля актываў якога ў сукупных актывах усёй банкаўскай сістэмы складае каля 42%, паказчык дастатковасці нарматыўнага капіталу з улікам вынікаў ацэнкі склаў 17,5% пры ўстаноўленым Нацбанкам мінімальным значэнні нарматыву 10,625%.

Патэнцыйнае невыкананне нарматыву дастатковасці капіталу выяўлена ў Белаграпрамбанку, Белінвестбанку і Альфа-Банку. Наш фінансавы рэгулятар адзначыў, што гэтыя банкі прадставілі ў Нацбанк планы па забеспячэнні дастатковасці нарматыўнага капіталу для пакрыцця патэнцыйнай крэдытнай рызыкі. «Гэтыя планы прадугледжваюць мерапрыемствы па зніжэнні банкамі крэдытнай рызыкі, у тым ліку за кошт паляпшэння якасці забеспячэння па выдадзеных крэдытах, а таксама па павышэнні капіталізацыі за кошт прыбытку, у першую чаргу шляхам аптымізацыі выдаткаў і прыцягнення субардынаваных крэдытаў», — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы Нацбанка.

Спецыялісты адзначаюць, што ўрадам ужо выконваецца шэраг канкрэтных мер па мінімізацыі такой рызыкі, у тым ліку ў частцы дакапіталізацыі банкаў з пераважнай доляй уласнасці дзяржавы. Так, прынятыя рашэнні аб павелічэнні статутнага фонду Белінвестбанка і перадачы з балансу банка часткі актываў, якія характарызуюцца павышанай рызыкай, у акцыянернае таварыства «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь». Створана агенцтва па кіраванні актывамі, якому будзе перададзена частка актываў з павышанай рызыкай з балансу Белаграпрамбанка, а таксама прынята рашэнне аб прадастаўленні гэтаму банку субардынаванага крэдыту. Акрамя таго, прынята рашэнне аб рэструктурызацыі праблемнай запазычанасці шэрагу арганізацый аграпрамысловага комплексу.

У Нацбанку ўпэўнены, што празрыстая незалежная ацэнка актываў беларускіх банкаў будзе спрыяць умацаванню даверу да банкаўскай сістэмы з боку замежных інвестараў і прыцягненню замежнага капіталу як у выглядзе прамых інвестыцый, так і ў выглядзе доўгатэрміновых крэдытаў. А з улікам паспяховага вопыту практыка правядзення працэдуры ацэнкі якасці актываў будзе працягнута.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Акцыі

# АДНА ДАРОГА — АГУЛЬНЫЯ МЭТЫ

**У Валожынскім раёне прайшоў міжнародны велапрабег «BIKES4SDGS» у падтрымку Мэт устойлівага развіцця ААН. У прабегу ўдзельнічала больш як 500 чалавек з 35 краін свету.**

Адзін з натхняльнікаў і арганізатараў гэтага грандыёзнага мерапрыемства — **кіраўнік прадстаўніцтва ААН у Беларусі Санака САМАРАСІНХА.** Спіс партнёраў і спонсараў велапрабегу ўражвае. Сярод іх — Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства лясной гаспадаркі, Міністэрства спорту і турызму, Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі, Глабальны экалагічны фонд, Мінскае веласіпеднае таварыства. Іх прадстаўнікі адгукнуліся на запрашэнне Санака Самарасінха асабіста прыехаць у Пяршаі, актыўна падтрымаць прасоўванне ў Беларусі Мэты развіцця, а таксама палюбавацца ўнікальнай прыгажосцю Налібоцкай пушчы, якую гэты жыхар далёкай Шры Ланкі палюбіў усім сэрцам. Ён нават сказаў публічна ў Пяршаях, што пушчу лічыць сваім другім домам у Беларусі, прывозіць сюды сваіх замежных гасцей і сяброў. Таму не выпадкова фініш прабегу быў абраны па маляўнічым высокім беразе ракі Іслач у заказніку «Налібоцкі».

Санака Самарасінха, у прыватнасці, звярнуў увагу на змены клімату. «Калі мы нічога не будзем рабіць, то страцім нашу планету. Сёння падумайце аб тым, што нам трэба зрабіць у наступныя 15 гадоў, каб захаваць планету для нашых дзяцей».

Сярод удзельнікаў прабегу былі міністры, студэнты, журналісты, музычныя зоркі, людзі з інваліднасцю, вядомыя спартсмены, мясцовыя аматары спорту, прадстаўнікі міжнародных, дзяржаўных, грамадскіх арганізацый, бізнесу. Яны сабраліся ў гэты дзень на цэнтральнай плошчы ў вёсцы Пяршаі. Маршрут велапрабегу быў арганізаваны ў ашчадным рэжыме і падзелены на некалькі этапаў. Першы этап — 2 км асфальтаванай дарогі. Другі этап — 6 км. Трэці — 10 км. На кожным этапе былі арганізаваны месцы прыпынку, дзе мелася магчымасць трохі адпачыць, выпіць чаго, перакусіць, а таксама прыняць удзел у конкурсах.

Паралельна праходзіў і 15-кіламетровы сплаў на байдарках па рацэ Іслач з фінішам у вёсцы Белакорац. Дарэчы, там жа фінішавалі ўдзельнікі веламаршруту.

Многія, як прынята цяпер казаць, медыйныя персоны прыбылі ў Пяршаі са сваімі веласіпедамі. Напрыклад, міністр



спорту і турызму Аляксандр Шамко ахвотна расказаў аб сваім «жалезным» сябры, якому ўжо амаль 6 гадоў. Паводле яго слоў, гэта недарагі, надзейны і зручны веласіпед. І наогул, язда на веласіпедзе — гэта даступны для насельніцтва від спорту, які далучае моладзь да здаровага ладу жыцця.

Прызёр Алімпійскіх гульняў і васьміразовы чэмпіён свету па веласпорце Наталля Цылінская таксама прайшла маршрут на сваім веласіпедзе.

Але асаблівую ўвагу мясцовых жыхароў, якія назіралі за ходам прабегу, прыцягнуў упрыгожаны малюнкамі цюльпанаў двухмесны веласіпед. Яго прывезлі ў Пяршаі часовы паверэны Нідэрландаў у Беларусі Паўль ван Ооствейн і яго жонка.

А скончыўся ў раёне вялікі спартыўны дзень вогнішчам Дружбы на краі пушчы і вячэрнім канцэртам.

Нагадаем, адносна нядаўна дзяржавы — члены ААН прынялі Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця да 2030 года. Яна змяшчае шэраг мэт, накіраваных на ліквідацыю галечы, захаванне рэсурсаў планеты і забеспячэнне дабрабыту для ўсіх. Кожная з 17 мэт утрымлівае шэраг паказчыкаў, якія павінны быць дасягнутыя на працягу 15 гадоў.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА**

■ Пытальнік

# ШТО ЛІЧЫЦЬ ПЕРАДПЕНСІЙНЫМ УЗРОСТАМ?

**Раней, калі чалавеку да пенсіі заставалася два гады, яго не маглі звольніць. Ці захавалася гэта гарантыя пасля пенсійнай рэформы? І як цяпер падлічыць перадпенсійны ўзрост?**

**Анатоль,** *Мінск.*



Гарантыі па працягненні і заключэнні новага кантракта з работнікамі перадпенсійнага ўзросту захаваюцца. Чалавека, якому застаецца не больш за два гады да дасягнення агульнаўстаноўленай пенсійнай планкі, не могуць звольніць з прадпрыемства, калі ён добрасумленна працуе і не парушае працоўную, выканальніцкую і вытворча-тэхналагічную дысцыпліну. Гэта норма прапісана ў пастанове Савета Міністраў №728 ад 15 верасня 2016 года.

З пачатку наступнага года перадпенсійны ўзрост будзе паступова павышацца. Так, у 2017-м працягненне кантракта на два гады будзе гарантавана мужчынам, якія ў 2017-м дасягнуць 58 гадоў 6 месяцаў, і жанчынам, якім споўніцца 53 гады 6 месяцаў. У 2018-м перадпенсійным узростам будзе лічыцца 59 і 54 гады адпаведна.

У 2019 годзе гарантыю па працягненні працоўнага дагавора да агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту (для 2019-га гэта стане парог у 61 год 6 месяцаў і 56 гадоў 6 месяцаў) будуць мець работнікі, якім 59 гадоў 6 месяцаў і 54 гады 6 месяцаў, у 2020-м — тыя, каму 60 і 55 гадоў.

Перадпенсійным узростам у 2021 годзе стане планка ў 60 гадоў 6 месяцаў для мужчын і 55 гадоў 6 месяцаў для жанчын. А з 2022-га і далей — 61 і 56 гадоў адпаведна.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# ХВІЛІНА ДЛЯ МАМЫ, ГАДЗІНА — ДЛЯ БАБУЛІ

## У Мінску з'явіліся новыя сацыяльныя паслугі

**Паслугу для пенсіянераў «Унучка на гадзіну» цяпер прапануюць у Цэнтральным раёне сталіцы. «Унучкамі», якія будуць дапамагаць пажылым людзям, стануць работнікі мясцовага тэрытарыяльнага цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва. Яны гатовы прыбраць у кватэры, памыць вокны, аплаціць «камуналку», схадзіць па прадукты ці ў аптэку.**

Паслуга платная. Кошт залежыць ад таго, колькі часу пойдзе на тое ці іншае заданне, і разлічваецца з нормы 3 рублі 30 капеек за гадзіну.

Новаўвядзенне прадугледжана для пенсіянераў, якія не знаходзяцца на надомным абслугоўванні. Каб скарыстацца паслугай, чалавеку неабходна проста патэлефанаваць у ТЦСАН (па нумары 290-63-02 ці 290-62-09) і пакінуць заяўку. Што зручна, ніякіх дакументаў для гэтага збіраць не трэба. Замовіць «унучку» могуць толькі жыхары Цэнтральнага раёна.

Кастрычніцкі раён сталіцы запускае з 1 кастрычніка паслугу «Хвілінка для мамы». Бацькі, якім няма з кім пакінуць дзіця, змогуць прывесці яго на некалькі гадзін у ТЦСАН, дзе за малым прыглядзяць педагогі-псіхолагі. А мама тым часам паспее схадзіць да ўрача, падстрыгчыся ў цырульні ці з'ездзіць у краму.

Заяўкі на паслугу будуць прымаць з усяго горада. Спецыялісты гатовы сядзець з дзецьмі рознага ўзросту: і з малымі, якім яшчэ няма года, і з 8-гадовымі школьнікамі. Самым малодшым абяцаюць забяспечыць догляд, а старэйшым прапануюць заняткі на развіццё.

Работу арганізуюць так, каб бацькі не прыводзілі ў адзін і той жа час рознаўзроставых сыноў і дачок. Плануецца, што дзеці будуць заставацца пад доглядам псіхолагаў не больш за дзве гадзіны. Кошт паслугі — 3 рублі 30 капеек у гадзіну. Падрабязнасці па тэлефонах 219-74-19 і 219-74-00.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# МІРАЖ СА СКРЫНІ

**Дысперсія, рэфракцыя, інтэрферэнцыя, палярызацыя, аберацыя... Звычайны школьнік, які чуе гэтыя тэрміны, нахіляе галаву ніжэй за парту і марыць, каб толькі не выклікалі да дошкі гэта растлумачваць.**



І зусім іншая справа, калі ён бачыць на свае вочы ўсё тое, што нават вымавіць можна не з першага разу. Рэакцыя супрацьлеглая — пераканалася асабіста. У музей гомельскага палаца Румянцавых і Паскевічаў прывезлі выстаўку, якая здольная пераканаць дзяцей і дарослых: навука зусім не складаная, калі тлумачыць яе з дапамогай інтэрактыўных экспанатаў. Іх вырабілі ў польскім цэнтры навукі «Капернік» і ўпершыню прывезлі ў Беларусь. Такім чынам утварылася экспазіцыя пад назвай «Відавочнае і неймавернае: оптыка».

Спачатку вялізныя драўляныя скрыні ў палацавых інтэр'ерах здаюцца нязграбнымі. Для дарослых. Бо дзяцей такія ўмоўнасці хвалююць мала, і яны проста кідаюцца да вялізных цацак, асабліва калі чуюць немагчымае: «Рукамі кранаць!»

Чапаць, рушыць, паварочваць, усоўваць галаву можна і трэба, каб урэшце пабачыць, напрыклад, міраж. Такі маленькі міражык — у выглядзе гузіка. Якога там, дзе ты яго бачыш, насамрэч няма. Але ён ёсць у зусім іншым месцы. Інтэрактыўныя ўстаноўкі выстаўкі дазваляюць гуляць з колерам і ценямі, зразумець, як працуе святло, як звязаны паміж сабой розныя колеры і ствараюцца аптычныя ілюзіі.

На выстаўцы не адно павелічальнае шкло незвычайнага памеру і формы, люстэркі, якія перамяшчаюцца... Тут можна ўбачыць навакольны свет праз анагліфічныя акуляры, у якіх адзін святлафільтр чырвоны, а іншы — бірузовы. Ілюзіі, падобныя на фокусы, выклікаюць эмоцыі, якія заахвочваюць дзяцей развівацца і зусім не баяцца школьнай фізікі, адзначае аддалены эфект наведвання экспазіцыі яе куратар Валерыя Лядзяева:

— Усе прадстаўленыя на выстаўцы прадметы разлічаны на актыўнае ўзаемадзеянне з чалавекам. Важныя ўражанні, якія чалавек атрымлівае шляхам свайго асабістага даследавання. Менавіта такім чынам можна зразумець пэўныя навуковыя законы. Любы праект пачынаецца з мары. Мы ўвасабляем мару любой мацi: каб яе дзіця развівалася і рэалізоўвалася па-сапраўднаму. Каб яно цікавілася навукай, а не завучвала механічна складаныя фармулёўкі са школьных падручнікаў. Навукі праз кнігі спасцігаюцца не заўсёды проста. А такая інтэрактыўная гульня значна спрашчае гэты працэс.



Сапраўды, незвычайныя экспанаты дазваляюць убачыць уласцівасці святла, пагуляць з колерамі і светлавымі праменямі. Тут і дарослым дазваляецца пакруціць велізарны калейдаскоп і паглядзецца ў крывыя люстэркі. Арганізатары сцвярджаюць, што знаёмства з іх праектам абавязкова разбурыць стэрэатыпы пра тое, што навука і чараўніцтва несумяшчальныя. Бо кожны наведвальнік адчувае на сабе сілу незвычайных з'яў фізікі.

Пасля Гомеля экспазіцыю плануюць паказаць у Мінску і Гродне. А наступны праект, які прыедзе з Польшчы ў Гомель, будзе прысвечаны гуку. Фізіку, такім чынам, можна будзе не толькі пабачыць, але і пачуць: ад «тамтама» да смартфона. Пакуль жа гомельскія вучні мараць:

— О! Каб тут школьныя ўрокі фізікі праводзіць!

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Вецер з Балтыкі

## Сіноптыкі абяцаюць кароткачасовыя дажджы, а ўначы суцэльны туман

**У канцы тыдня на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць няўстойлівая і халодная паветраная маса, якая паступае з поўначы Еўропы, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**



У пятніцу чакаецца воблачна з праясненнямі. Па ўсходняй палове краіны прагназуюцца сур'ёзныя дажджы, а на астатняй частцы тэрыторыі краіны ўдзень чакаюцца месцамі кароткачасовыя ападкі. Вецер паўночна-заходні, умераны, па паўночным усходзе краіны парывісты. Максімальная тэмпература паветра на працягу дня будзе вагацца ад 8 да 14 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 16 градусаў. Атмасферны ціск будзе слаба расці.

Нічога добрага ад нябёсаў не чакаюць сіноптыкі і на выхадныя. У суботу і нядзелю характар надвор'я будуць вызначаць няўстойлівыя і халодныя паветраныя масы, якія паступаюць да нас з боку Балтыйскага мора. Захаваецца тэмпературны рэжым, як у кастрычніку. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах будзе згушчацца туман. Вецер паўночна-заходні, умераны. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 цяпла, а максімальная ўдзень будзе дасягаць плюс 10—17 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Кампус

# ПРАФСАЮЗНЫЯ СТЫПЕНДЫІ ДЛЯ АКТЫВІСТАЎ

**Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі будзе выплачваць стыпендыі студэнтам-актывістам прафсаюзнага руху. Такое рашэнне было прынята на пасяджэнні Прэзідыума ФПБ.**

Штогод кожная першасная прафсаюзная арганізацыя ўстаноў прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі можа вылучыць адну кандыдатуру на атрыманне стыпендыі ФПБ. Разлічваць на поспех ад прафсаюзаў могуць студэнты, якія, акрамя актыўнага ўдзелу ў грамадскай рабоце, маюць высокія паказчыкі ў навукова-даследчай, творчай або спартыўнай дзейнасці. Прычым сярэдні бал паспяховасці ў іх павінен быць не ніжэй за 8. Камісія Федэрацыі прафсаюзаў правядзе конкурс сярод кандыдатаў, па выніках якога 37 лепшых на працягу года будуць атрымліваць спецыяльную стыпендыю. Лаўрэатам стыпендыі ФПБ можна стаць толькі адзін раз за ўвесь перыяд навучання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# «ВЫПАРВАЛІ» ПАЛІВА

## Выяўлена схема крадзяжу гаручага на чыгунцы

**Супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Заводскага РУУС г. Мінска сумесна з калегамі з упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама выяўлена схема крадзяжу на чыгунцы дызельнага паліва, якое належыць РУП «Беларуснафта-Мінскаўтазапраўка», у колькасці больш за дзве тоны.**

Сем службовых асоб чыгуначнай станцыі, у тым ліку службовая асоба Беларускай чыгункі, злівалі паліва з чыгуначных цыстэрнаў на пад'язных пуцях да адной з прамысловых зон сталіцы. Дарэчы, у абавязкі работніка Беларускай чыгункі ўваходзіла па-пярэджанне, спыненне праваправушэнняў і крадзяжоў, а таксама прыцягненне праваправушальнікаў да адміністрацыйнай адказнасці. Аператыўнікі ўстанавілі, што зламыснікі ў загадзя абумоўленым месцы, дзе знаходзіліся гружаныя цыстэрны, з дапамогай інструмента адкрывалі накрыўкі цыстэрнаў, а дызельнае паліва злівалі ў канiстры і звозілі на асабістым аўтатранспарце.

Група была затрымана падчас чарговага начнога злачынства. У іх было канфіскавана каля сотні канiстраў з гаручым, а на ахоўных клапанах цыстэрнаў — выяўлены сляды фізічнага ўздзеяння. Агульная сума выкрадзенага дызельнага паліва толькі за адну «начную вылазку» склала 2 500 рублёў, што адпавядае 120 базавым велічыням.

Праваахоўныя органамі адпрацоўваюцца каналы збыту ўкрадзенага паліва, бо на нафтабазе рэгулярна фіксаваліся розныя аб'ёмы нястачы, якую спісвалі за кошт хібнасці вымярэнняў натуральнага змяншэння паліва пры выпарэнні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

В **суд Ганцевичского района Брестской области** поступило заявление об объявлении умершим КОШКИНА Александра Аркадьевича, 2 октября 1960 года рождения, уроженца г. Минска, ранее проживающего по адресу: г. Ганцевичи, ул. Заслонова, д. 9, кв. 13.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Кошкине А.А., в отношении которого ставится вопрос об объявлении его умершим, сообщить суду Ганцевичского района.

В извещении, опубликованном в газете «Звязда» № 181 от 20.09.2016 г., кадастровый номер земельного участка, расположенного в д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, 15А, **следует читать: 623288001601000029.** УНП 600181536


Фота БЕЛТА.

# ЗАРОБКІ БУДУЦЬ РАСЦІ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так, вырасла колькасць вакансій у сельскай гаспадарцы, што было звязана з гарачай парой уборкі ўраджаю, але бачна і пэўнае ажыўленне ў прамысловасці і будаўніцтве ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Стала больш месцаў па рабочых прафесіях — амаль 54 працэнты ад усіх прапаноў.

Што да новых працоўных месцаў, то за паўгода на такія вакансіі ўладкаваліся 34,5 тысячы чалавек. З іх 19,5 тысячы — за кошт стварэння новых прадпрыемстваў. Адметна, што плацяць на гэтых вакансіях прыкладна ў 1,3 раза больш, чым у сярэднім па краіне. Так, на новых месцах у транспартнай дзейнасці заробак складае 997 рублёў, у той час калі ў сярэднім у гэтай галіне — 794. А работнікі інфармацыі і сувязі, якія працуюць на створаных сёлета прадпрыемствах, атрымліваюць на тысячу рублёў больш, чым іх сярэднестатыстычныя калегі.

Найбольш актыўна новымі месцамі прырастае сфера паслуг: больш за палову створаных вакансій з'явілася менавіта там.

## Вахцёры ў раёне непатрэбны

Калі глядзець па рэгіёнах, то карцінка розная. Напрыклад, для Іванаўскага раёна тэндэнцыя росту вакансій не характэрна. «У нас традыцыйна высокая напружанасць на рынку працы», — кажуць ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацабароне мясцовага райвыканкама.

У Ашмянскім жа раёне ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя знізіўся з 1,2 працэнта ў чэрвені да 0,8 працэнта ў верасні, паведаміла **першы намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацабароне райвыканкама Анастасія СУРГАН**. А колькасць свабодных месцаў за гэты ж перыяд вырасла на 14 працэнтаў. Цяпер прапаноў стала больш, чым саіскальнікаў, — на адну вакансію прэтэндуе 0,8 чалавека. Памер заробкаў, якія абяцаюць на свабодных месцах, вагаецца ад 240 да 550 рублёў.

У Оршы павялічыўся попыт на кваліфікаваных спецыялістаў.

— Шукаюць урачоў, інжынераў, эканамістаў. З'яўляюцца таксама месцы слесараў, токараў, швачак, электраманцёраў, — адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацабароне Аршанскага райвыканкама Наталля ДРАЗДОВА**.

А вось вакансій некваліфікаванай працы ў раёне практычна няма. Прыбіральшчыцы, дворнікі, вартаўнікі і вахцёры незапатрабаваныя.

У цэлым, калі ў маі ў Оршы і ваколіцах налічвалася 263 вакансіі, то ў верасні ўжо — каля 300. Напружанасць на рэгіянальным рынку за гэты перыяд упала з 3,2 беспрацоўнага на месца да 2,6.

## Працаваць за капейкі ўжо не хочуць

У сталіцы большае прапаноў для топ-менеджараў, дырэктараў кампаній у сферы продажаў і фінансаў.

— Увогуле па ўсіх вакансіях назіраецца павялічэнне попыту, — заўважае **дырэктар кансалтынгавай кампаніі «Квадрат» Святлана КАРАСЦЯЛЁВА**, якая займаецца падборам офісных работнікаў. — Так, нядаўна нас прасілі знайсці 25—30 спецыялістаў па продажах з веданнем англійскай мовы ў кол-цэнтр (яны будуць займацца тэлефоннымі продажамі фінансавых паслуг).

Сярод прычын павышэння актыўнасці на рынку эксперт адзначае звычайны сезонны попыт (многія вярнуліся з адпачынкаў) і паляпшэнне сітуацыі ў эканоміцы.

— У Расіі апошнія тры месяцы нашы калегі (спецыялісты па падбору персаналу. — **Аўт.**) нарэшце працуюць у «нуль». Дагэтуль паўтара года ў мінус сыходзілі. Спачатку ў Расіі стала павялічвацца колькасць вакансій, цяпер гэтая хваля дакацілася і да нас, — дзеліцца назіраннямі Святлана Карасцялёва.

Назіраецца і паступовае павышэнне заробкаў. Але пакуль працадаўцы не спяшаюцца плаціць значна больш.

— Хоць ужо час, — упэўнена эксперт. — Таму што колькасць вакансій расце, а прэтэндэнтаў меншае. Хутка будзе выбіраць саіскальнік. Працадаўцам спатрэбіцца некалькі месяцаў, каб зразумець гэта і прыняць новыя ўмовы. Яны вымушаны будуць павялічыць заробкі, каб прыцягнуць добрых спецыялістаў.

**Стала больш месцаў па рабочых прафесіях — амаль 54 працэнты ад усіх прапаноў.**

Калі напачатку гэтага года людзі гатовы былі хапацца за любую работу, не звяртаючы ўвагі на заробак, то цяпер знайсці ахвотных працаваць за капейкі немагчыма. Святлана Карасцялёва кажа, што некаторым наймальнікам, якія шукаюць спецыялістаў танней, даводзіцца адмаўляць. Так, пасадай менеджара па продажах з заробкам у 450 рублёў саіскальніка ўжо не зацікавіш. Ці нядаўна шукалі прадаўца ў сталічную краму бытавой тэхнікі: аклад — 230 рублёў, з прэміяй і дадатковымі доплатамі — 350 рублёў набягае. На пасаду было патрэбна 10 чалавек, яшчэ і з вопытам у гэтай сферы. Рэкруцёры за такое заданне нават не ўзяліся.

Ці працягнецца тэндэнцыя росту колькасці вакансій да канца года?

— Па нашых прагнозах, так, — гаворыць Алег Токун. — Мы пакуль не бачым негатыўных тэндэнцый, каб сітуацыя пагоршылася. На рынку ўстанавілася раўнавага.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# УБОРКА НА КОНКУРСНАЙ АСНОВЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Найбольш выгадныя ўмовы прапанавала клінінгавая кампанія — 870 тысяч рублёў (8,7 мільярда), такім чынам сэканомлена 278 тысяч (2,78 мільярда) застаюцца ў насельніцтва. Як нам растлумачыла **намеснік дырэктара па добраўпарадкаванні і санітарным утрыманні жыллёвага фонду ЖКГ Ленінскага раёна Анастасія ВАРАБ'ЁВА**, максімальная сума была разлічаная, зыходзячы з Указа Прэзідэнта №107 «Аб аплаце жыллёва-камунальных паслуг, што аказваюцца насельніцтву». У ім гаворыцца пра тое, што кошт утрымання дапаможных памяшканняў, інакш кажучы пад'ездаў, не павінен перавышаць 53 капеек (5 300 рублёў) з аднаго жыхара. Паняцце «утрыманне» ўключае ў сябе не толькі ўборку, але і дэзынфекцыю і дэратызацыю (комплексныя меры па прафілактыцы з'яўлення і знішчэння грызуноў), так што суму ў 53 капейкі яшчэ прыйдзецца падзяліць.

Першага жніўня кампанія прыступіла да выканання сваіх абавязкаў, да якіх адносіцца сухая і вільготная ўборка пад'езда і ліфта, калі ён ёсць, ачыстка дошак аб'яваў, абслугоўванне смеццепрыёмных камер. На сайце ЖКГ ёсць падрабязная інфармацыя для насельніцтва на гэту тэму, акрамя таго загадзя па ўсім раёне былі развешаны аб'явы, якія паведамлялі жыхарам пра змены. Зваротная рэакцыя не прымусіла сябе доўга чакаць: жыльцы жыва зацікавіліся новаўвядзеннем. Цяпер у кожным пад'ездзе вывешаны графік правядзення розных тыпаў уборкі, таму прасачыць за яе выкананнем стала значна прасцей. Акрамя таго, работнікаў кантралююць адразу ў трохбаковым парадку: самі жыхары, прадстаўнікі ЖКГ і непасрэдна кампанія-наймальнік. Пасля завяршэння работы прыбіральшчык павінен атрымаць у любога паўналетняга жыхара пад'езда подпіс, які пацвярджае тое, што ён сапраўды выканаў свае абавязкі.

## На варце чысціні

Няглездзячы на, здавалася б, дзейсную сістэму, па словах Анастасіі Вараб'ёвай, на пачатковым этапе прыйшлося сутыкнуцца з мноствам цяжкасцяў. «Людзям здаецца, што калі за ўборку ўзяўся іншы падрадчык, то ўсё павінна ўмомант і кардынальным чынам змяніцца. Вядома, гэта немагчыма. Ёсць усталяваная перыядычнасць выканання тых ці іншых работ, напрыклад, вільготная ўборка праводзіцца 2 разы на месяц, а сухая (з дапамогай веніка) два разы на тыдзень, дошка аб'яў чысціцца раз у тыдзень, а мыццё вокнаў праводзіцца наогул два разы на год. Да таго ж па віне жыхароў могуць адбыцца непрадбачаныя сітуацыі, з-за якіх можа скласціся няправільнае ўражанне. Калі хтосьці лічыць, што такі аб'ём уборкі недастаткова, ён можа пашырыць комплекс паслуг, вядома ж, за дадатковую плату. Але да гэтага часцей за ўсё не даходзіць», — тлумачыць Анастасія.

**ДАРЭЧЫ:**

**Ленінскі раён не адзіны, у якім адбыліся такія змены. У бліжэйшы час «уборка на конкурснай аснове» ахопіць усю сталіцу.**

— У гэтым выпадку жыхароў усхвалявала навіна пра тое, што ўборкай будзе займацца прыватная кампанія, таму яны сталі значна больш пільна сачыць за чысцінёй у пад'ездах. І на нас, і на кампанію абрынуўся сапраўдны шквал званкоў, — працягвае спецыяліст. — У самой кампаніі ўжо адбылося павелічэнне колькасці тэлефонных ліній з дзвюх да чатырох. У бліжэйшы час плануецца ўвядзенне функцыі, якая дазволіць даведацца чаргу вашага званка. Такая тэхналогія ўжываецца на адзіным нумары 115. Дарэчы, кантакт-цэнтр ЖКГ за гэты перыяд таксама атрымаў нямала зваротаў, звязаных з уборкай пад'ездаў. Гэтыя пытанні яны пасля перанакіроўвалі на ЖЭСы, якія, у сваю чаргу, ужо звярталіся непасрэдна да клінінгавай кампаніі. У хуткім часе гэты працэс будзе спрошчаны, і заяўкі напрамую будуць трапляць выканаўцам.

Многія дзівяцца: чаму ў нас не спыталі? Аднак згодна з ускладзенымі на яго функцыямі, КУП «ЖКГ» можа прымаць такія рашэнні, не параіўшыся з жыхарамі. Дарэчы, указам 535 «Аб прадастаўленні жыллёва-камунальных паслуг» устаноўлена, што жыхары могуць самі займацца ўборкай, аднак гэта павінна адбывацца на самай справе, а не фармальна. Гэтак жа сама складаецца графік, кантралюецца якасць работы, калі яна нездавальняючая, адбываецца зварот да паслуг спецыялізаваных работнікаў. Да таго ж, каб перайсці на самастойную ўборку пад'ездаў, трэба атрымаць згоду 100 працэнтаў жыхароў. Як правіла, такой аднагалоснасці няма ніколі.

Уборка пад'ездаў — гэта далёка не адзіны від паслуг, выбар падрадчыкаў для якіх ажыццяўляецца на конкурснай аснове. Па гэтай жа сістэме адбываецца, напрыклад, догляд дваровых тэрыторый, абрэзка дрэў, пакос травы. Цяпер вядзецца пошук адзінага аператара для абыходжання з адходамі, які займаўся б усімі відамі адпаведных работ.

Як падкрэсліла Анастасія, у бліжэйшы час ажыятаж вакол уборкі пад'ездаў павінен значна зменшыцца. «Адназначна, не стала горш. Аднак па выніках жніўня клінінгавая кампанія атрымала толькі крыху больш за 50 працэнтаў сумы, якая агаворвалася, бо не былі выкананы ўсе ўмовы. Гэта можна растлумачыць перыядам асваення, думаю, у верасні вынікі будуць іншымі», — выказалася спецыяліст.

## Самае складанае — работа з людзьмі

Каб мець поўнае ўяўленне аб сітуацыі, мы вырашылі пагаварыць з **дырэктарам** той самай **клінінгавай кампаніі ТДА «Клінінг-Плюс» Віталём САБАЛЕЎСКІМ**. Як аказалася, для іх гэта першы вопыт работы ў такой сферы, да гэтага фірма займалася абслугоўваннем адміністрацыйных будынкаў. Супрацоўнікі кампаніі нават не маглі ўявіць, наколькі моцна ад гэтага адрозніваецца работа ў жылым фондзе. «Жыхары ўспрымаюць усё вельмі асабіста. Пад'езд — гэта ўжо частка дома, таму тэрміны ліквідацыі праблем значна сціскаюцца. Калі ў офісе ўсе пройдуць міма пылу на лесвіцы і нават не заўважаць, то ў доме не толькі звярнуць на яго ўвагу, але і адразу ж сядуць на тэлефон — разбірацца, — расказвае Віталь. — Таму першы час падстроіцца пад такі рэжым было дастаткова цяжка. Да таго ж узнікала мноства дробных праблем, якія вельмі перашкаджалі рабоце: пачынаючы ад таго, дзе браць ваду, і заканчваючы тым, як патрапіць у пад'езд. Хочацца адзначыць істотную падтрымку супрацоўнікаў ЖКГ, якія дапамагалі адаптавацца ў новых умовах».

— На мой погляд, толькі такая тэндарная сістэма і мае права на існаванне, — лічыць Віталь Сабалеўскі. — Здаровая канкурэнцыя дазваляе адначасова знізіць кошт і павысіць якасць паслуг. Мы заключылі дагавор на год. Мне, як бізнесмену, такая мадэль не надта зручная: за гэты перыяд мы паспеем толькі-толькі асвойтацца ў гэтай сферы. Аптымальны перыяд — 3 гады, бо дагавор тэрмінам на 5 гадоў можа прывесці да таго, што выканаўца «расслабіцца» і якасць паслуг зноў знізіцца.

Пашыраць сферу дзейнасці або пераходзіць на іншыя раёны кампанія пакуль не гатовая. Аднак у тэндарах працягвае ўдзельнічаць: для маніторынгу рынку канкурэнцыя, дарэчы, тут даволі высокая.

«Я не магу сказаць, што якасць чымсьці адрозніваецца. Вы ж разумееце, што гэты агульны пакет прадугледжвае мінімальны комплекс паслуг, таму не варта чакаць чысціні, як у кватэры. Мы бяром больш нізкім коштам і для многіх цяпер гэта галоўнае. Магчыма, у нас крыху больш высокія патрабаванні да работнікаў, стараемся пазбягаць, так скажам, сацыяльна нестабільных людзей. У жніўні была даволі моцная цякучка кадраў, паколькі многія не чакалі, што аб'ём работы будзе немаленькім, — дзеліцца Віталь.

Суразмоўца адзначае, што прыклад у працы бяруць з еўрапейскіх і амерыканскіх калег. Віталь нават асабіста працаваў за мяжой, у тым ліку і займаўся ўборкай, так што пра спецыфіку работы ведае не па чутках. Аднак у сферы абслугоўвання жылога фонду арыентавацца на іншыя краіны даволі няпроста, бо істотна адрозніваюцца найбольш распаўсюджаныя формы ўласнасці. Напрыканцы дырэктар кампаніі выказвае думку, што змены ў сферы ЖКГ неабходныя і тая работа, якая цяпер праводзіцца, безумоўна, мяняе сітуацыю ў лепшы бок.

## Кілімок як яблык разладу

Адпраўляемся на месца дзеяння — у пад'езд у перыяд уборкі. Нас вітае ўсмешлівая жанчына — гэта яе «фронт работы». Вера Коўцік прыйшла ў кампанію ў сярэдзіне жніўня, да гэтага займалася ўборкай тэнісных кортаў. Працай задаволеная: цяпер ёй часта даводзіцца чуць словы ўдзячнасці ад ветлівых жыхароў. На незвычайную форму — фартух светлага колеру — звяртаюць увагу, цікавяцца: «Вы новенькая?» А таварыская Вера сама пускаецца ў тлумачэнні, маўляў, я прадстаўляю клінінгавую кампанію, у мае абавязкі ўваходзіць гэта і гэта. Вось і падчас нашай гутаркі да яе звяртаецца пажылы мужчына з пытаннем: «Вы ў нас цяпер будзеце прыбіраць?» На што яго жонка, не чакаючы адказу ад Веры, тлумачыць: «Так, усё цяпер па-новаму. Гэта прыватная фірма. Слова яшчэ такое незвычайнае — клінінгавая».

Такая цікавасць не выпадковая. Уборка праходзіць ва ўжо даволі новай пяціпавярхоўцы, дзе ўсе адно аднаго ведаюць амаль паўстагоддзя, тут кожная падзея — навідавоку. «Людзі ва ўзросце спуску не даюць. Сказваецца савецкая загартоўка», — дзеліцца Вера. Вось і цяпер да сваёй кватэры на трэці паверх работніцу кліча бабуля, якая, пакуль падняліся за ёй, паспявае расказаць пра сваё жыццё. «У мяне пад кілімком не прыбрана. Гэта ўсё суседка туды накідае. Кватаранты...» — скардзіцца пажылая жанчына. Вера спакойна прыбірае, хоць у яе абавязкі гэта і не ўваходзіць. Часам прасцей прамаўчаць. Дарэчы, гэта не адзіная праблема, звязаная са згаданым прадметам інтэр'еру. Некаторыя на поўным сур'ёзе абураюцца, а потым скардзяцца, што іх кілімок перад уваходнымі дзвярыма ў працэсе ўборкі быў ссунуты. Вось ужо сапраўды спецыфіка працы!

**Дар'я КАСКО,** *kasko@zviazda.by*



ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# «Як на нашай ніўцы сягоння дажынкі»

## Першы міні-мюзікл праекта «Наперад у мінулае» гатовы да эфіру

**Цягам верасня гледачы канала «Беларусь 3» назіралі за тым, як святкуюць дажынкі на Смаргоншчыне, Любаншчыне і Полаччыне, слухалі жніўныя песні ў іх аўтэнтычным гучанні і сучаснай апрацоўцы. А ўжо ў нядзелю, 25 верасня, выйдзе ў эфір праграма, якая аб'ядноўвае і падсумуе ўсе «дажынкавыя» выпускі праекта «Наперад у мінулае». Адметна, што тут прагучыць не адна традыцыйная песня ў сучаснай інтэрпрэтацыі, а цэлых шэсць.**
**Карэспандэнт «Звязды», які вандруе па Беларусі разам са здымачнай камандай праграмы, адной з першых паглядзела міні-мюзікл і ўжо сёння дзеліцца ўражаннямі з нашымі чытачамі.**



### «Божа, памажы, хлеба ўрадзі»

У традыцыйнай культуры беларусаў жніво — надзвычай важная справа. Гэта і падвядзенне вынікаў летняй працы, і магчымасць быць упэўненымі ў тым, што зіма не будзе галоднай. Нездарма ж на жніво прынята было надзяваць чыстыя кашулі, як на свята, а словы жыта і жыццё, збожжа і Бог маюць агульныя этымалагічныя карані. Калі жыта зжата, ураджай сабраны ў свіран, можна святкаваць і адпачываць.

Як вядома, нашы продкі спявалі не толькі калі на душы было весела. Песня дапамагала ў працы, надавала ёй адметны рытм, давала магчымасць працаўнікам нейкім чынам аб'ядноўвацца, быць заўсёды ў камунікацыі — стаць вялікім калектывам, які робіць агульную і важную для ўсіх справу. Таму не выпадкова жнеі пачыналі спяваць яшчэ па дарозе ў поле, спевы суправаджалі сам працэс жніва, а таксама гучалі падчас святочнага застолля ў гаспадара, што завяршала свята.

Гэтыя этапы — песня перад жнівом, малітва, зварот-прывітанне да маці-зямлі, непасрэдна жніво з песнямі, услаўленне гаспадара і песні-любаванні апошнім нязжатым участкам поля — агульныя для ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Так, на Смаргоншчыне не пачыналі працаваць, пакуль тройчы не абыходзілі з песнямі нязжаты кавалак поля, а на Любаншчыне перад жнівом абавязкова прамаўлялі «Ойча наш...» як просьбу Богу дапамагчы ў працы і даць добры ўраджай. На Полаччыне прынята было вітаць зямлю прыкладна такімі словамі:

«Добры дзень, зерне буйное, зямелька-маці, прымі мой нізкі паклон. Дай мне сілу вялікую, каб мае ручкі не балелі, каб ножкі не нямелі, каб спінка не ныла, каб я ўсё поле зваявала, усё жыта пажала».

### «Як пайду я каля лесу блізка»

Рытуаламі суправаджаўся і сам працэс жніва. Напрыклад, на Полаччыне з першых зжатых сцяблін збожжа жнеі рабілі для сябе і для касцоў адмысловыя паясы. Іх тут называюць вязьмо. Вязьмо — гэта своеасаблівы абярэг, ён дае сілы на работу і засцерагае ад ляноты. Пачынаць работу можна толькі тады, калі падперазаўся вязьмом. Дарэчы, тут жнеі не жалі жыта сярпамі, а звязвалі скошанае збожжа ў снапы і складалі іх у копы. У працы жанчынам дапамагалі мужчыны — менавіта яны касілі жыта ў полі. Распачынаў касьбу па традыцыі старэйшы мужчына, а потым да яго далучаліся іншыя касцы.

**Як цудадзейны нашы продкі ўспрымалі і апошні зжаты сноп — яго называлі «дзедам». Гаспадар павінен быў заплаціць жнеям за добрую працу ды пачаставаць іх за сталом.**



Жанчынам у працы часта дапамагаюць касцы.

У песнях, што гучалі падчас жніва, жанчыны казалі не толькі пра цяжкую працу, але і прадчувалі яе прыемныя вынікі. Як у гэтай песні з вёскі Багатырская, што на Полаччыне:

*Як пайду я каля лесу*
*блізка, каля зямлі нізка,*
*Як нажну я восем коп*
*жыта, дзявятую пшонкі.*
*Навару я восем бочак піва,*
*дзявятую мёду,*
*Напяку я кораб з пірагамі,*
*Сазаву я ўсю радзіну*
*ў госці.*

У гэтым рэгіёне прынята складваць копы з дзевяці снапоў. Восем ставілі блізка адзін да аднаго, а дзявяты — каб «замыкаў» капу — наверх.

### «Чыя гэта барада?»

Агульнай для розных рэгіёнаў Беларусі з'яўляецца і традыцыя пакідаць нязжатым апошні кавалак поля. Яго называлі «барадой». Нашы продкі верылі, што душа нівы — яна мае выгляд казлападобнай істоты — хаваецца ў апошніх нязжатых каласах. Таму ахвяравалі духам нівы хлеб, соль, яйкі, упрыгожвалі бараду стужкамі, кветкамі, ягадамі рабіны. На Смаргоншчыне і Любаншчыне бараду завівалі адмысловым чынам, упрыгожвалі кветачкамі, клалі лустачку хлеба — каб поле было чыстым і ўраджайным. А вось і прыклад песні-ўслаўлення барады з Полаччыны:

*Сядзіць голуб на дубе,*
*дзівуецца барадзе.*
*Дзіва-дзіва, дзіва-дзіва.*
*Чыя гэта барада,*
*уся мёдам уліта?*
*Дзіва-дзіва, дзіва-дзіва.*
*Уся мёдам уліта*
*і блінамі ўшыта.*
*Дзіва-дзіва, дзіва-дзіва.*

Магічныя ўласцівасці прыпісваліся і самой зжатай ніве. Так, на Любаншчыне дзяўчаты качаюцца па жніве, каб зямля ім здароўя і сіл дала. Кажуць такія словы: «Ніўка-ніўка, аддай мне сілушку. На коніка — лой, на ніўку — гной, а мне на здароўе». Як цудадзейны нашы продкі ўспрымалі і апошні зжаты сноп — яго называлі «дзедам». З ім дзеўкі качаліся па барадзе, каб хутчэй замуж выйсці. Лічылася таксама, што дзед валодае лекавай сілай, яго неслі да хворых, цяжарных ды маладух, якія нядаўна выйшлі замуж.

Завяршала працэс жніва адметная песня. Яе жнеі спявалі ўжо па дарозе з поля дадому.

*А ў нас сёння вайна была.*
*Усё поле зваёвана,*
*Усё жыта пажата,*
*У снапы павязана.*
*«...пану ўчынілі славу».*

Паўсюль у Беларусі прынята апошні дажынкавы сноп дарыць гаспадару, каб той яго на покуць паставіў і захаваў да наступнага ўраджаю. Пры гэтым казалі прыкладна такія словы: «Пастаў яго ў хаце на куце, а нам заплаці па чырвончыку на падале». Лічылася, што зерне з дзеда валодае цудадзейнай сілай: калі пачынаецца сяўба азімых, яго дадаюць да насення, каб добра ўрадзіла жыта на наступны год.

Нават песня пра гэта распавядае:

*А мы свайму пану ўчынілі*
*славу:*
*Жыта ўсё пажалі, ў снапы*
*павязалі,*
*У копы панасілі,*
*у Бога папрасілі.*
*Радзі, Божа, жыта*
*на другое лета,*
*На другое лета лепшае*
*за гэта.*

А ў вёсцы Сінькі, што на Смаргоншчыне, для гаспадара плялі вянок з апошніх зжатых каласоў. Надзявалі яго на галаву з пажаданнямі: «Каб у нашага гаспадара галава і цела не балела, каб здабытае спажыў і на свеце доўга жыў». Гаспадар у сваю чаргу павінен быў заплаціць жнеям за добрую працу ды і пачаставаць іх за сталом. Пра гэта — і песня з Полаччыны:

*Барашачак*
*чорненькі-чорненькі*
*Па століку*
*коціцца-коціцца.*
*Нам гарэлкі*
*хочацца-хочацца.*
*Барашачка мыць*
*будзем—мыць будзем,*
*Гарэлачку піць*
*будзем—піць будзем.*
*Барашачка*
*вымылі—вымылі,*
*Гарэлачку выпілі—выпілі.*

**Песня перад жнівом, зварот-прывітанне да маці-зямлі, услаўленне гаспадара і любаванне апошнім нязжатым кавалкам поля характэрныя для ўсіх рэгіёнаў Беларусі.**

У адной нашай дзеўкі, у Надзі, кавалер быў — з іншай вёскі. Нічога не скажаш, нядрэнны хлопец, хораша заляцаўся да яе, потым замуж паклікаў... І яна за яго, напэўна, пайшла б, можа, нават з падскокам, калі б не яго мянушка — Блінец, калі б не прозвішча — Блінахватаў. (Відаць, нехта з продкаў бліны хапаў проста з патэльні. Дык, можа, і на яго цяпер не напячэшся: «пахватае» і паесць, нікому не пакінуўшы?..) Вось праз гэта і ваганні ў дзеўкі былі.

А хлопец аказаўся ўпарты: няяк, нічога Надзі не кажучы, вырашыў яе перад фактам паставіць, заявіцца ў сваты. Прычым не проста так! У якасці «цяжкай артылерыі» ён уласную маці ўзяў, жанчыну валявую, уладарную (Надзя яе ніколі не бачыла, але ўжо баялася).

І вось той дзень, дакладней — добры летні надвячорак. Дзеўкі нашы — і Надзя ў тым ліку — купаліся ў Дняпры, пераплылі на левы бераг, яшчэ і там крыху пабоўталіся — папішчалі, паплялі вяночкі з красак, чуюць — нейкі крык са свайго берага.

— Надзя! Дамоў! — галёкаюць хлапчукі.

— Чаму? — не разумее тая.

— Блінец прыехаў!

— Чаго?

Хлопчыкі — малодшы брат яе з сябрам — ужо нашмат цішэй, каб вёска не чула:

— У сваты...

— Чаго-чаго? — бо дзеўкам жа таксама не чуваць.

Сцэна, карацей, амаль як у фільме «Волга-Волга», калі пісьманосіца Любоў Арлова тэлеграму прымала.

Тады ўжо хлапчукі разлляваліся і ў дзве глоткі:

— У сва-ты!

Ці не ўся Дняпершчына гэту навіну пачула, з найбліжэйшых хат цёткі на двор павыходзілі. І дзеўкам, вядома ж, хоць-нехаць давялося сабраць манаткі і паплысць назад у Лучын.

На беразе яшчэ адсапліся крыху ды пабеглі да Надзінай хаты. «Група падтрымкі» там пад вокнамі засталася, а сама яна, як была — босая, мокрая, на галаве вяночак — у дом.

Пані Блінахватава ўбачыла яе, ацаніла знешнасць (пра тое, што дзеўка прыстойная, з добрага роду і вучыцца ў інстытуце, разнюхала раней) і, ухваліўшы выбар сына, пайшла ў наступ.

Надзі, карацей, адступаць не было куды: згадзілася выйсці замуж. Бацькі сталі пра вяселле гаварыць. А прозвішча — гэта ж не тэма, гэта ж, як бышцам, само сабой?.. «Ага, счас», — як кажа гумарыст Задорнаў, бо Надзя згадзілася выйсці за гэтага хлопца, але ж каб ягонае прозвішча ўзяць, — ды нізавошта: ну, не будзе яна Блінахватавай і ўсё тут!

Думаеце, пры рэгістрацыі шлюбу ў іх канфлікт узнік і вяселле не адбылося? Памыляецеся. Хлопцу было галоўнае гэтую дзеўку ў жонкі ўзяць, і ён саступіў...

Можа, таму, што ведаў: дзеці, калі Бог дасць, будуць Блінахватавы, а ўсё астатняе не вельмі і важна.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## ДЗЕД І АРХІМЕД

Прайшла чарговая ўступная кампанія і звязаная з ёй калатнеча, напярэдадзе (у тых, каму пашчасціла паступіць) — вучоба і, як на мой погляд, дык найцікавейшы, найлепшы час у жыцці. Экзамены, праўда, яго трохі «псуюць», але ж, калі не траціць аптымізму...

Свой самы першы іспыт падчас першай жа студэнцкай сесіі я, што называецца, заваліў, бо паступаў у інстытут пасля службы ў войску і таму зусім забыўся, чым адрозніваюцца лагарыфмы ад інтэгралаў, а ў білеце было акурат пра іх. У выніку для ўсіх аднакурснікаў Каляды былі Калядамі — з халадцамі, пірагамі, і «пальцам піханай» каўбасой, а ў мяне — са здачай хваста. Крыўдна, — хоць проста з моста, але ж і рэчку лёдам сквавала!

А таму іду я на перездачу, атрымліваю заданне вывесці формулу плошчы круга і... з бляскам, за некалькі хвілін вываджу яе! Экзаменатар сваім вачам не верыць, кажа, што я першы з яго студэнтаў, хто так лёгка «ўзяў круг». А заадно — пытаецца, што ж атрымалася мінулы раз, чаму я правалій экзамен? Сціпла кажу: «Хвалявауся», хоць насамрэч сакрэт быў у іншым. У школе я быў проста закаханы ў геаметрыю! Што і прыдалося — на экзамене па вышэйшай матэматыцы.

Вось з гэтым, можна сказаць, непрадказальным у жыцці і вучобе, што дзе можа спатрэбіцца, сутыкаўся потым яшчэ не раз.

На трэцім курсе, здаецца, вывучалі мы досыць цікавую дысцыпліну — гідраўлікай называецца, навуку пра вадкасці, якія, у залежнасці ад розных параметраў, цякуць у розных напрамках то хутчэй, то павольней.

На першы погляд гэта ўсё проста. Нават дзіця пры дапамозе вентыля можа і магутны вадаспад на кухні зрабіць, і кволенькае кап-кап. А на дачы дык і наогул ці не кожны сваімі рукамі створыць вясёлку. (Для гэтага, паліваючы градкі, дастаткова сціснуць кончык шланга і накіраваць яго ў бок сонца.) Карацей, гідраўліку за асноўны прадмет мы не лічылі (бо не дэталі машын), але ж вывучалі. І здавалі таксама, бо ад гэтага іспыту, не менш чым ад іншых, залежалі памеры стыпендый.

Дык вось. Здаю я экзамен, з задавальненнем, можна сказаць, пачынаю рашаць задачы, звязаныя з велічынёй усё тога ж «ціску», але час ляціць, а вынікаў — нуль: ні ў адной з задач адказ не сыходзіцца, а шукаць памылкі ўжо няма калі: экзаменатар кліча да стала. «Усё, — думаю, — канец падкраўся непрыкметна». Я ледзь паспяваю на хаду прачытаць у білеце першае пытанне: «Вялікія вучоныя гідраўлікі свету»...

Тут варта сказаць, што выкладаў у нас гэты прадмет... дзед (прабачце за рыфму): чалавек гадоў шасцідзесяці-сямідзесяці, фанатычна ўлюбёны ў сваю гідраўліку і да таго ж — трохі філосаф па сваёй натуры. Ён любіў, напрыклад, параўноўваць крывяносныя сасуды чалавека з трубамі, на сценках якіх з цягам часу нешта адкладваецца: у маладых — меней, у пажылых — больш, адсюль і здароўе, і стан іх скуры... Ды што там — ён наогул увесь гэты свет падпарадкаваў бы законам гідраўлікі.

І вось я са сваім «глыбокім» веданнем прадмета саджуся перад ім за стол.

Ён, вядома ж, бачыць маю разгубленасць. Бачыць і тое, колькі я скрэмзаў паперы, спрабуючы рашыць задачы... А таму спачатку хоча падтрымаць: пытаецца, што я ведаю пра «вялікіх гідраўлікаў».

Як тапелец за саломінку я хапаюся за Архімеда — найвялікшага вучонага, бо я трохі ведаю пра ягонае жыццё, чытаў раней, а ў дадатак — во дзе шчасце! — якраз напярэдадні.

Карацей, панесла мяне нібы тога Астапа: расказаў экзаменатару і дзе жыў Архімед, і чым праславіўся, ледзь не ў падрабязнасцях распавёў гісторыю асады Сіракуз... Пасля чаго агаломшаны выкладчык ціха спытаўся: «Можа, вы ведаеце і тое, хто забіў Архімеда?» «А як жа!» — пачаў я, і мой расказ стаў заключным акордам усёй «гераічнай сімфоніі»!..

Потым, праз гады, я калі-ніколі прыгадваў гэты выпадак і думаў, як важна не траціць аптымізму, не здавацца. Бо я ж мог адразу сказаць выкладчыку, што не рашыў ніводнай задачы і, крый Божа, займець чарговы «хвост». А так маю залікоўку ўпрыгожыла чарговая пяцёрка.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

## НЯМА ЛЕПЕЙ, ЯК УКРАДЗЕШ...

Бяруся сцвярджаць, што ў любімай звяздоўскай рубрыцы «Алё, народ на провадзе!» век будзе доўгім, бо жыццё — яно ж не стаіць на месцы, яно ўвесь час падкідвае чытачам новыя і новыя прыгоды, пра якія проста грэх не расказваць іншым!

Неяк раз, напрыклад, іду я дадому палуднаваць, па дарозе з паштовай скрынкі забіраю жыроўку. З аплатай яе я стараюся не цягнуць, бо яно ж спакайней спіш, калі нічога нікому не вінен.

Вось і той раз гляджу я на ўказаныя сумы, дастаю з кішэні самапіску і нататнік, каб на сваёй лесвічнай пляцоўцы запісаць паказанні лічыльніка (і самому ж цікава, колькі там за свята «набегла»?), падымаюся на свой паверх і...

Карціна алеем, як той казаў: на пляцоўцы, прыкладыўшы вуха да суседскіх дзвярэй, стаіць прыбіральшчыца (яна, высвятляецца, прыходзіць у наш пад'езд?)... Але чаго? Каб, кажучы мовай пракурора, украсці — незаконным шляхам атрымаць інфармацыю аб тым, што робіцца ў чужым жытле?

Няёмка мне стала за гэту жанчыну, таму, каб даць ёй зразумець, што яна тут не адна, я ціха кашляю ў кулак. Кабета куляй адскоквае ад дзвярэй і літаральна прыліпае да сцяны (прычым якраз там, дзе лічыльнікі...). На твары ў яе страх і разгубленасць, бо злавілі ж, «застукалі», можна сказаць, «на месцы злачынства». Прычым нехта, можа, нават горшы, чым гаспадар кватэры — нейкі мужык з самапіскай і блакнотам...

Трымаючы іх напагатове, я, вядома ж, не меў намеру пытацца ў кабеты, што яна тут робіць (а тым больш запісваць адказ). Я як мага спакайней (лічыльнік у кабеты за спінай) сказаў:

— Прабачце, мне б паказанні зняць...

Ад такой заявы твар жанчыны яшчэ больш бялее, вусны дрыжаць:

— Ніякіх паказанняў я даваць не буду! Не чапайце мяне! Не маеце права! — крычыць яна і, кінуўшы сваю швабру, куляй ляціць уніз па прыступках, выбягае з пад'езда. У ім наступае цішыня.

...Стаяў я ў ёй і думаў, як жа няёмка ўсё атрымалася! Можа, гады ў рады гэта жанчына прыйшла ў пад'езд — з вядром вады і швабрай, прыйшла, трэба разумець, каб навесці парадак? (Ну, можа, заадно і нешта пачуць.). А тут прыносіць мяне, патрабуючы нейкія паказанні...

І гэта ж я быў у джынсах і сакольцы. А калі б у форме пракурора?

Праўду кажуць: «Няма лепей, як украдзеш, няма горш, як зловяць.

**А. П.,**
*г. Беразіно.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

## РУЧНАЯ РАБОТА



### Нашы блізкія, сыходзячы ад нас, у простых рэчах пакідаюць нам сваё блаславенне

На выхадныя задумалі зварыць самаробны кетчуп. Смаката — ні ў якае параўнанне з куплёным не ідзе. Не шкада ні часу, ні працы (яблыкі, памідоры ды цыбулю трэба здрабніць, і калі блэндара ў гаспадарцы няма, накруцішся той мясарубкі — рукі чуць не будзеш). Але блэндар у нас нарэшце з'явіўся, і ці то з гэтай прычыны, ці то ад сквапнасці я гэтым разам купіла ажно дзесяць кіло памідораў. Пракруціўшы іх у цуда-машыне разам з яблыкамі і цыбуляй, якіх, згодна з рэцэптам, належала дадаць па кілаграму, сталі ламаць галаву, у чым жа гэту вітамінную кашу, што ледзь трымалася, каб не пераплюхнуцца цераз верх самага вялікага таза, варыць. Нарэшце знайшлі ў кладоўцы вялікі дванаццацілітровы гаршчок, у які ўсё выдатна змясцілася. Але тут паўстала іншая праблема: а чым яго мяшаць, пакуль варыцца? Гаршчок глыбокі, ні лыжкі, ні іншы кухонны рыштунак да дна не дастаюць. Прыгараць — і заўважыць не паспееш...

І раптам мама ўспомніла: недзе за печчу бацькава лапатка ляжыць. Пакорпаўшыся там, я нарэшце намацала доўгую пляскатую прыладу з ручкай, падобную на драўляны цацачны меч, толькі закруглены, даўжынёй з добры метр, калі не больш. Лапатка была гладкая, бы адмыслова адпаліраваная, пацямнелая ці то ад часу, ці то ад гарачых страў, якіх ёй было мешана-перамешана. Наш бацька выразаў яе менавіта для зімовых нарыхтовак, якія рабіліся калісьці амаль у прамысловых маштабах: у сям'і было шэсць чалавек, двое з якіх студэнты, што жылі ў інтэрнаце. Варэнне ці грыбы варыліся ў выварцы або ў тым жа гаршку на вуліцы. Двухканфорачная газавая пліта гэткага цяжару не вытрымала б, таму на двары ў зацішку ставілі трыног, разводзілі пад ім вогнішча, на трыног ставілі посуд з варывам. Як яно перла цераз верх, калі дроў было больш, чым трэба! Выратаваць яго магла толькі тая лапатка, якой можна было за некалькі секунд усё перамяшаць. Пасля мама ці бабуля клалі яе на краі посуду ўпоперак — яна не давала тым жа грыбам пераліцца цераз край — гэткі вясковы правобраз вечка-«невыкіпайкі»...

Мы не даставалі яе са спрадвечнага месца за печчу гадоў мо дзесяць, калі не больш. І цяпер, пяшчотна гладзячы цёмнае дрэва, уважліва разглядаючы яго, успаміналі і тыя шчаслівыя восеньскія дні, калі дома збіралася ўся сям'я, і чалавека, што рабіў гэты просты, але такі патрэбны хатні рыштунак, якога, каб і хацеў, нідзе не купіш. Са звычайнай тоўстай дошкі выразаць такую лапатку, зрабіць яе бліскуча-гладкай, было, пэўна, не так проста — наш бацька не быў ні сталяром, ні цесляром. Але ён стараўся, клапоцячыся пра сваіх жанчын, пра сваю гаспадарку. Яго няма на гэтай зямлі ўжо больш за трыццаць гадоў, а рэч, зробленая яго рукамі, нібы дагэтуль захоўвае яго цяпло, і тых, хто ёй карыстаецца, кожны раз успамінаць яго з любоўю і ўдзячнасцю...

Думаю, не памылюся, калі скажу, што ў кожнай сям'і захаваліся такія рэчы-напамінкі ад людзях, якіх ужо няма побач з намі. Не адзенне, не ўпрыгажэнні, не падарункі — гэта з зусім іншага разраду, а менавіта тое, што нашы блізкія рабілі сваімі рукамі. Напрыклад, дзедава кашолка (вялізны, плецены з лазы кош, па форме падобны на гаршчок для кветак, з дзвюма ручкамі). Дзед памёр у 70-х, а ў тую кашолку і праз дваццаць гадоў збіралі агуркі. Ці бабулін падзорнік — вязаная шыдэлкам занавеска пад ложак (ложкі калісьці былі высокія, з бліскучымі нікеляванымі більцамі). Бабулі няма з 82-га, а яе памяць і сёння ляжыць на дубовай камодзе ў гарадской кватэры ўнучкі. Сніжная дзявіца, адкуль такая багатая, з карункавымі выкшталцонымі ўзорамі, ды яшчэ такая вялікая, сурвэтка. А гэта той самы падзорнік, разрэзаны на дзве паловы і сшыты па краях...

Мы карыстаемся гэтымі рэчамі штодня, не асабліва задумваючыся пра іх паходжанне. Але аднойчы спыняемся, нібы бачым іх упершыню, уважліва разглядаем, лёгенька гладзім рукой, бы дакранаемся пяшчотна да таго чалавека, які іх рабіў, адчуваем яго прысутнасць, яго цяпло і спагаду, што ахінае нас праз недасягальнае і неспазнанае. Нашы блізкія, сыходзячы ад нас, у простых рэчах пакідаюць нам сваё блаславенне. Гэткія немудрагелістыя абярэгі, што дапамагаюць захоўваць памяць Роду і адчуванне сваёй да яго далучанасці, якая ў гэтым шалёным свеце самотна адзінокіх людзей так патрэбная кожнаму.

Шкада толькі, што новыя рэчы, зробленыя ўжо сённяшнімі пакаленнямі, у нашых дамах не з'яўляюцца. За рэдкім выключэннем, калі гаспадар ці гаспадыня прафесійна звязаныя з нейкім рамяством. Навошта рабіць нейкі рыштунак, калі ўсё, што душа пажадае, можна заказаць праз інтэрнэт, нават не ўстаючы з канапы, — кур'ер прывязе або прышлюць па пошце хай сабе і з іншага канца свету. Навошта займацца рукадзеллем, калі зноў жа ёсць адмысловыя інтэрнэт-крамы ці, калі на тое пайшло, прадпрымальныя бабулі-майстрыхі, у якіх можна замовіць што заўгодна. Мы развучыліся рабіць рукамі — тое, што незалежна ад прафесіі, ад здольнасцяў, умелі рабіць нашы бацькі і ўсе папярэднія пакаленні.

Атрымліваецца, след на гэтай зямлі пакінем крыху карацейшы. А яшчэ — самотна адзінокіх нашчадкаў, якім, калі пойдзем у недасягальнае і неспазнанае, не будзе да чаго дакрануцца.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by* ■

## Ушануюць лепшых юных чыгуначнікаў

**25 верасня адбудзецца ўрачыстае закрыццё летняга сезона Дзіцячай чыгункі імя К.С. Заслонава. Падчас яго сёлета было перавезена 43 тысячы пасажыраў.**

На станцыі «Заслонава» адбудзецца ўрачыстая лінейка, прысвечаная закрыццю 61-га сезона. На мерапрыемстве чатыром лепшым навучэнцам Дзіцячай чыгункі ўручаць ганаровыя граматы ад Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, а лепшым выпускнікам — памятныя гадзіннікі ад начальніка Дзіцячай чыгункі. Акрамя таго, чатыры юныя чыгуначнікі будуць узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік Дзіцячай чыгункі». Лепшыя машыніст, дзяжурны па станцыі, праваднік і пуцявік у рамках конкурсу «Лепшы па прафесіі» атрымаюць дыпломы і граматы. Адмысловым кубкам будзе адзначаны пераможца футбольнага турніру сярод змен Дзіцячай чыгункі. Таксама ўзнагародзяць «Лепшую змену» сезона, якой уручаць пераходны вымпел і дыплом. Першы цягнік у гэты дзень адправіцца са станцыі «Заслонава» ў 11.00, а апошні ў 14.52, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

Дзіцячая чыгунка сёння — гэта, перш за ўсё, першая ступень прафесійнага карпаратыўнага навучання, якую дзеці праходзяць, займаючыся ў гуртку «Юны чыгуначнік». У маі 2009 года быў адкрыты новы навучальны цэнтр з прафільнымі навучальнымі класамі і камп'ютарным кабінетам. Заняткі ў ім праводзяцца з кастрычніка па красавік.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»,** г. Минск, ул. Некрасова, 9 |

**Предмет аукциона**

**Имущество бывшей компрессорной станции Ивацевичи, расположенной по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, д. 2,2 км юго-западнее деревни Холопья, в составе:**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| Здание КЦ-3 | Здание нежилое | 2476 кв.м | 122/С-2251 |
| Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие, бетонное покрытие, покрытие из плитки, сетчатое ограждение, ворота, ворота | | | |
| Здание проходной КЦ-3 | Здание нежилое | 95,1 кв.м | 122/С-2246 |
| Здание санитарно-бытового корпуса | Здание нежилое | 111,5 кв.м | 122/С-2250 |
| Здание котельной КЦ-3 | Здание нежилое | 276,9 кв.м в т.ч. подвал | 122/С-2248 |
| Здание КТП АВО газа КЦ-3 | Здание нежилое | 145,5 кв.м | 122/С-2249 |
| Здание ЗРУ-10 кВ КЦ-3 | Здание нежилое | 389,9 кв.м | 122/С-2247 |
| Здание КНС КЦ-3 | Здание нежилое | 20,8 кв.м | 122/С-2245 |
| Составные части и принадлежности: подвал, КНС (сооружение): насос фекальный к60/30, задвижка стальная ф 50, кран ф50, вентилятор Ц Ц-70 (ВАО-071-4), манометр измерительный | | | |
| Система грозозащиты КЦ-3 | Сооружение специализированное энергетики | | 122/С-15277 |

**Передаточные устройства**

внутриплощадочные электросети КЦ-3 с инв. №122/С-15271, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженность – 557 м;

внутриплощадочные теплосети с инв. №122/С-15270, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, протяженность – 329,9 м;

внутриплощадочные водопроводные сети КЦ-3 с инв. №122/С-15273; назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения; протяженность – 1624,2 м;

внутриплощадочные сети канализации КЦ-3 с инв. №122/С-15275, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, протяженность – 302,3 м;

**Оборудование**

КНТП промплощадки КЦ-3, инв. № 100000030413;

мостовой кран машзала электрический КЦ-3, инв. № 100000030630;

тельфер электрический машзала КЦ-3, инв. № 100000030649

кран мостовой ручной КЦ-3, инв. № 100000030631

таль ручная червячная КЦ-3, инв. № 100000030650;

радиоканальная система передачи извещений «Маяк» КЦ-3, инв. №100000032836

**Начальная цена с НДС 20% – 470 481,00 бел. руб. (BYN) (4 704 810 000 BYR) Снижена на 40%**

**Сведения о земельном участке**: кадастровый номер: 123400000001000151. Площадь (га): 3,1410
Категория: земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения
Целевое назначение: земельный участок для обслуживания компрессорной станции «Ивацевичи» (компрессорный цех №3). Участок предоставлен продавцу на праве постоянного пользования

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 15 рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предмет аукциона может быть снят с аукциона организатором в любое время до объявления его проданным

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 26.08.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **06.10.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **05.10.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **Филиал СУ-159 ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж»,** г. Брест, ул. Янки Купалы, 120/2. Тел.: +375 296592523, +375 162 42 55 10, +375 17 256 90 01 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, расположенный по адресу: г. Брест, ул. Гродненская, д. 55Д, в составе:**

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 750 | **Специальный автомобиль МАЗ 5337 (автокран КС-45729А), 2007 г.в.** | 25 185 руб. 06 коп. (251 850 600) | 1 259 руб. 25 коп. (12 592 500) |
| 2 | 728 | **Трактор колесный МТЗ-80, 1989 г.в.** | 2 106 руб. 22 коп. (21 062 160) | 105 руб. 31 коп. (1 053 110) |
| 3 | 804 | **Легковой автомобиль GAZ-31105, 2007 г.в.** | 1 122 руб. 12 коп. (11 221 200) | 56 руб. 11 коп. (561 100) |
| 4 | 373 | **Подмости ПВС 12, 1979 г.в.** | 9 521 руб. 06 коп. (95 210 600) | 476 руб. 05 коп. (4 760 500) |
| **Спецтехника, распложенная по адресу: г. Брест, ул. Янки Купалы, 120/2, в составе:** | | | | |
| 9 | 734 | **Автогидроподъемник ВС222-01 на базе ЗИЛ-131** | 11 716 руб. 60 коп. (117 165 960) | 585 руб. 83 коп. (5 858 300) |

**Капитальное строение, расположенное по адресу: г. Пинск, ул. Гайдаенко, д. 55В, Брестская область**

| № п/п лота | Наименование (назначение) | Составные части и принадлежности | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 10 | **Гаражи** (здание специализированное транспорта) | Склад, уборная, ворота, калитка, забор | 280,6 | 130/С-30666 |

**Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,1459 (га), предоставлен на праве постоянного пользования для размещения промышленных объектов

| | |
|---|---|
| Начальная цена с НДС 20% | **48 757,03 белорусского рубля BYN 487 570 300 белорусских рублей BYR** |
| Шаг аукциона | **2 437,85 белорусского рубля BYN 24 378 500 белорусских рублей BYR** |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, контактный телефон +375 296592523 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 05.08.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **10.10.2016 в 12.00 по адресу: филиал СУ-159 ОАО «ТРЕСТ № 26 ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ», г. Брест, ул. Янки Купалы, 120/2** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **06.10.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | - капитальное строение, инв. № 451/С-228 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание АБК), площадью 148,1 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2. Составные части и принадлежности: электрическая сеть, водопроводная сеть, канализационная сеть;<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-231 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – котельная), площадью 339,3 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2;<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-230 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – компрессорная), площадью 67,2 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2;<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-226 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция), площадью 46,6 кв.м с трансформатором ТМ-400/10/0,4, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2, корп. 3;<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-14167 (назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – внутриплощадочный ж/д путь), площадью 420,2 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2. Составные части и принадлежности: линейная часть подъездного железнодорожного пути, стрелочный перевод, железнодорожный переезд |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | - кадастровый номер 422356300002000075 (назначение – размещение промышленных объектов), площадью 3,3565 га, расположенный по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,051 га;<br>- кадастровый номер 422356300002000753 (назначение – земельный участок для размещения объектов железнодорожного транспорта), площадью 0,0119 га, расположенный по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2/1 |
| **Начальная цена продажи** | 25 425,71 р. (двадцать пять тысяч четыреста двадцать пять рублей семьдесят одна копейка) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1271,29 р. (одна тысяча двести семьдесят один рубль двадцать девять копеек) |
| **Продавец** | ОАО «Дорожно-строительный трест № 6», 230026, г. Гродно, ул. Победы, 13. Тел. 54-31-08, факс 8-017-210-84-14 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3% от конечной цены продажи объекта |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 10 октября 2016 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 25.08.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 04 октября 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

• Раздел и установление порядка пользования земельным участком
• Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
• Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
• Оценка всех видов собственности

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СтанкоГомель», 8 (0232) 75 71 11

| № лота | Наименование и характеристика объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Поперечно-строгальный станок 7307 ГТ, 1991 г.в., инв. №2700, расположен по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10 | **6 120,00 руб.** (61 200 000 бел. руб.) | **612,00 руб.** (6 120 000 бел. руб.) |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 24 октября 2016 г. в рабочие дни с 9[00] до 16[00] от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **26 октября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266 Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация» Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 23.09.2016 г. |
| **Условия продажи** | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Срок оплаты: 50% стоимости лота, сформированной на аукционе, должна быть выплачена победителем аукциона при заключении договора купли-продажи, а оставшаяся часть стоимости лота должна быть выплачена в течение месяца. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

**Подробная информация по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341-15-45**

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица - доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация».

# Крыжаванка



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **1.** Грошы (часам і прадукты), якія выдаюцца наперад у лік зарплаты. **4.** Прадстаўнік арганізацыі, установы, які выконвае службовыя, дзелавыя даручэнні. **7.** Партовы рабочы ў некаторых краінах. **9.** Вялікая рыбалоўная сетка. **11.** Той, хто варожа адносіцца да каго-, чаго-небудзь, сваімі дзеяннямі шкодзіць каму-, чаму-небудзь. **13.** Буйная жвачная жывёліна атрада парнакапытных (свойская і дзікая) з грузным тулавам і кароткай шыяй. **14.** Каманда, асабовы састаў карабля, самалёта, танка. **17.** Бервяно або тоўсты брус, умацаваны вертыкальна, стаўма. **19.** Апарат для вызначэння месцазнаходжання аб'екта з дапамогай адбітых ад яго гукавых або электрамагнітных хваль. **20.** Від спорту, кулачны бой па асобых правілах. **21.** Перыядычны пад'ём узроўню акіяна, мора. **22.** Вучэбны дапаможнік для пачатковага навучання грамаце. **26.** Палярная нырцовая качка з каштоўным мяккім цёплым пухам. **27.** Дзіцяня казы. **28.** Мужчына ў адносінах да сваіх дзяцей. **31.** Арфаграфічны знак, які злучае два словы ў адно. **32.** Вышэйшы ваенны чын або воінскае званне ў арміях некаторых дзяржаў. **33.** Кіраўнік факультэта ў вышэйшай навучальнай установе. **35.** Паўднёвае пладовае дрэва сямейства ружакветных, род дробнай слівы. **36.** Рэлігійная плынь, варожая догматам пануючай рэлігіі. **37.** Марскі грабежнік, разбойнік. **38.** Драпежная млекакормячая жывёліна сямейства сабачых, якая харчуецца пераважна мярцвячынай.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **2.** Пасажырская чыгуначная або параходная станцыя. **3.** Тонкае валакно, якое ў выглядзе адростка адыходзіць ад галаўнога і спіннога мозга і з'яўляецца састаўной часткай разгалінаванай сістэмы, здольнай служыць сродкам кіравання дзейнасцю арганізма. **5.** Металічны ўдарны музычны інструмент у выглядзе дыска з загнутымі краямі. **6.** Сістэма ведаў аб заканамернасцях развіцця прыроды, грамадства, мыслення і спосабах уздзеяння на навакольны свет. **8.** Паўднёвае фруктовае дрэва або куст сямейства гранатавых з ярка-чырвонымі кветкамі. **10.** Гладзевая тканіна з няроўнай вузлаватай паверхняй, прызначаная ў асноўным для жаночых паліто і касцюмаў. **12.** Сталёвае кавадлачка для кляпання касы. **15.** Вартасць, якая прыносіць яе ўладальніку-капіталісту прыбавачную вартасць шляхам эксплуатацыі наёмных рабочых. **16.** Адзінка часу ў 60 мінут, якую адлічваюць ад поўдня ці ад сярэдзіны ночы. **18.** Школьны вучнёўскі стол, злучаны ніжняй часткай з лаўкай. **20.** Падабраныя і прыгожа складзеныя ў пучок кветкі. **23.** Сухое пячэнне з клятчастым адбіткам на паверхні. **24.** Частка ўнутранага вуха, дзе знаходзіцца гукаўспрымальны апарат. **25.** Зборнік геаграфічных, гістарычных і інш. карт. **29.** Беларуская страва з мяснога фаршу, з рысам. **30.** Трапічнае дрэва, абястлушчаныя зярняты якога ідуць на прыгатаванне шакаладу. **33.** Загарадны дом для летняга адпачынку гараджан. **34.** Атмасфера, якая відна з зямлі — прастора ў форме купала, скляпення.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Аванс. 4. Агент. 7. Докер. 9. Невад. 11. Ворат. 13. Буйвал. 14. Экіпаж. 17. Слуп. 19. Лакатар. 20. Бокс. 21. Прыліў. 22. Азбука. 26. Гага. 27. Казачка. 28. Тата. 31. Злучок. 32. Маршал. 33. Дэкан. 35. Алыча. 36. Ерась. 37. Пірат. 38. Шакал.

**Па вертыкалі:** 2. Вакзал. 3. Нерв. 5. Гонг. 6. Навука. 8. Гранат. 10. Букле. 12. Бабка. 15. Капітал. 16. Гадзіна. 18. Парта. 20. Букет. 23. Вафля. 24. Вуліца. 25. Атлас. 29. Вожыкі. 30. Какава. 33. Дача. 34. Неба.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.57 | 19.05 | 12.08 |
| Віцебск — | 6.47 | 18.55 | 12.08 |
| Магілёў — | 6.47 | 18.55 | 12.08 |
| Гомель — | 6.44 | 18.52 | 12.08 |
| Гродна — | 7.13 | 19.20 | 12.07 |
| Брэст — | 7.14 | 19.21 | 12.07 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 12.56. Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

**Пр.** *Андрэя, Васіля, Глеба, Канстанціна, Мікалая, Паўла, Пятра, Яўгена.* **К.** *Тэклі, Багуслава.*



Фота Соф'і КУСЯНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Не разумею, чаму вегетарыянцы не ядуць сасіскі, мяса ж там няма.**

Муж — жонцы:

— Люся, ды ты зусім перабрала нахабства! Прыйшла ноччу ў дупель п'яная!

— Ды якая п'яная?! Мы з кумой выпілі ўсяго крыху! Я нават на кухні посуд увесь перамыла!

— Ага... Алеем!

**Усё залежыць ад настрою.**

**Калі ёсць настрой, ляжыш на канапе з энтузіязмам.**

**Ну, а калі настрою няма, тады валяешся на канапе без усякага натхнення.**

Сёма ўсяго толькі сказаў: «Прывітанне!», а Ганна ў думках згуляла вяселле і нарадзіла траіх дзяцей.




Малюнак Ганны КІСЛЮШЧАНКІ.

Даты | Падзеі | Людзі

### 23 ВЕРАСНЯ

**1846** год — нямецкім астраномам Іаганам Готфрыдам Гале была выяўлена восьмая планета Сонечнай сістэмы — Нептун. Чаму «выяўлена»? Таму што адкрыта яна была не на небе, з дапамогай тэлескопа, а ў цішы кабінета французскім астраномам Урбенам Левер'е. Так што перад Гале стаяла не надта складаная задача: накіраваць тэлескоп у пэўнае папярэдне вызначанае разлікамі месца, дзе ён і знайшоў новую планету.

**1934** год — нарадзіўся Віктар Іванавіч Парфёнаў, беларускі вучоны, батанік, эколаг. Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Аўтар больш чым 350 навуковых прац, у тым ліку 38 манаграфій. Асноўныя работы па фларыстыцы, геабатаніцы, экалогіі, сістэматыцы і эвалюцыі раслін. Стварыў сучасную беларускую фларыстычную школу. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972) за цыкл работ па вывучэнні расліннасці Беларусі.

**1936** год — нарадзіўся Эдвард Радзінскі, пісьменнік, драматург. Член Акадэміі Расійскага тэлебачання. Аўтар п'ес і дакументальна-біяграфічных твораў, тэлеаповедаў пра вядомых асоб рускай і еўрапейскай гісторыі.

**1938** год — нарадзілася Ромі Шнайдэр, аўстрыйская кінаактрыса, зорка аўстрыйскага, нямецкага і французскага кіно. Паводле апытання, праведзенага ў 2000 годзе, французы назвалі Ромі Шнайдэр самай выдатнай актрысай XX стагоддзя.

**1946** год — юбілей адзначае Павел Якубовіч, вядомы беларускі журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия». Лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» за праект газеты «У пошуках страчанага». Узнагароджаны трыма ордэнамі.



**Шчыра віншуем Паўла Ізотавіча і жадаем здароўя, натхнення і плёну!**

Было сказана

**Янка СІПАКОЎ, пісьменнік, публіцыст:**

*«Жалеза моцнае, але цярпенне і настойлівасць чалавека яшчэ мацнейшыя».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3756.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 верасня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12